Толькі вось ці павысіцца якасць абслугоўвання, ці стане больш утульней і чысцей у вагонах? Хацелася б верыць...

# СА СМАРГОНІ Ў ГРОДНА

У абласным цэнтры адбылося ўрачыстае адкрыццё персанальнай выстаўкі "На хвалях часу" нашага земляка, вядомага скульптара Уладзіміра Церабуна. Падставай да яе стварэння, па прызнанню аўтара, стаў шасцідзесяцігадовы юбілей творцы.

На пятнаццатай па ліку персанальнай выстаўцы Уладзіміра Церабуна сабраны скульптура, кераміка, жывапіс, малюнак, акварэль. Асобнае месца адведзена скульптурным праектам – кампазіцыям "Прысвячэнне Міцкевічу", "Свіцязянка", кампазіцыі, якая ў перспектыве ўпрыгожыць Савецкую плошчу абласнога цэнтра.

Варта падкрэсліць, што выстаўка "На хвалях часу" ўпершыню дэманстравалася менавіта ў Смаргоні. За паўгода смаргонцы і госці горада, якія наведваліся ў краязнаўчы музей, маглі па заслугах ацаніць талент нашага вядомага земляка.

**Алесь САВІЦКІ.**